***Удзельнікам XIX Міжнароднай***
***навукова-практычнай канферэнцыі***
***«Журналістыка-2017:***
***стан, праблемы і перспектывы»***

## Паважаныя сябры!

*XXI стагоддзе адкрыла шырокія перспектывы перад журналістыкай – значным палітычным і сацыяльным інстытутам, без якога немагчыма развіццё сучаснага грамадства. Засваенне новых платформ і новых магчымасцей сталі вызначальнымі кірункамі функцыянавання сродкаў масавай інфармацыі і камунікацыі. У эпоху найноўшых тэхналогій і глабалізацыі інфармацыйнай прасторы медыйны яе сектар з’яўляецца арыенцірам высокіх стандартаў якасці, маральна-этычны норм і грамадзянскай адказнасці.*

*У працэсе арганізацыі сучаснай інавацыйнай камунікацыі перад беларускімі сродкамі масавай інфармацыі паўсталі не менш адказныя заданы ўдасканалення ўсіх сфер грамадскага жыцця, выхавання ініцыятыўнага і дзейнага грамадзяніна, захавання нацыянальных каштоўнасцей і высокіх маральна-этычных ідэалаў.*

*Толькі высокакваліфікаваныя, кампетэнтныя супрацоўнікі сродкаў масавай інфармацыі, якія валодаюць высокім узроўнем грамадзянскай і этычнай адказнасці, здольныя ў сучасных умовах забяспечыць аб’ектыўнасць і дакладнасць інфармацыйнага поля. Вядучая роля медыя ў жыцці грамадства прад’яўляе самыя высокія патрабаванні да прадстаўнікоў журналісцкай прафесіі.*

*Комплекснае вывучэнне медыйнай практыкі ў сучасных умовах набывае асаблівую актуальнасць. Грунтоўны навуковы аналіз працэсаў функцыянавання СМІ будзе садзейнічаць абагульненню накопленага вопыту, стварэнню абгрунтаваных высноў і рэкамендацый прагнастычнага характару. Тэарэтычнае асэнсаванне пытанняў развіцця нацыянальнай і сусветнай медыяпрасторы дапаможа вызначыць асноўныя арыенціры функцыянавання сферы масавай камунікацыі як платформы для кансалідацыі грамадства, яго духоўнага ўдасканалення.*

*Ад імя Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь жадаю ўдзельнікам канферэнцыі плённай працы і значных навуковых дасягненняў!*

***Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ,***
***міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь***

